

ПРАЎДА АБ ВАЙНЕ — У ЛІСТАХ З АКУПАЦЫІ 4

ПА КІМ СУМУЮЦЬ «ПАРТЫЗАНСКІЯ МАДОННЫ» 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 МАЯ 2019 г. СЕРАДА № 84 (28951)

# ДЗЕНЬ, ЯКІ ЯДНАЕ ПАКАЛЕННІ

***Дарагія суайчыннікі!***

Сардэчна віншую вас з Днём Перамогі.

Дзявятага мая — свяшчэнная дата для кожнага беларуса. Дзень, які вярнуў нашаму народу права на жыццё і надзею на будучыню.

Мы шануем гераізм і бясстрашнасць абаронцаў Айчыны, якія верылі ў перамогу, мужна змагаліся за Радзіму. Высока цэнім самаадданасць працаўнікоў тылу і ўсіх, хто ў пасляваенныя гады ўзнімаў з руін разбураныя гарады і вёскі.

Нізкі паклон вам, дарагія ветэраны.

Вялікая Перамога аб'ядноўвае пакаленні, служыць прыкладам стойкасці і патрыятызму для моладзі, натхняе на стварэнне. Захаваць памяць аб подзвігу нашага народа — гэта гістарычны абавязак перад мінулым і будучым.

У гэты святы для нас дзень шчыра жадаю ўсім дабра, шчасця і дабрабыту. Нашай роднай Беларусі — міру і працвітання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



# Двайное свята Аляксандра Ігнатовіча

У ветэрана Вялікай Айчыннай вайны жыхара Мазыра Аляксандра Ігнатовіча дзявяты дзень мая — асаблівы, таму што ў свята Перамогі Аляксандр Іосіфавіч адзначае яшчэ і дзень свайго нараджэння: заўтра шаноўнаму мазыраніну споўніцца дзевяноста шэсць гадоў!

На парадным пінжаку ветэрана прымацаваны баявыя ордэны Чырвонай Зоркі і Славы трэцяй ступені, два медалі «За адвагу», медаль «За баявыя заслугі», медаль за «Абарону Ленінграда», юбілейныя медалі — такім чынам быў адзначаны ўдзел салдата-пехацінца, кулямётчыка Ігнатовіча ў перамозе над фашысцкай Германіяй. Васямнаццацігадоваму хлопцу давялося прайсці дарогамі вайны, як кажуць, ад званка да званка. Не толькі ўзнагародамі, але раненнямі, потам і крывёю, стратамі родных, холадам і голадам урэзаліся ў яго памяць жорсткая вайна і доўгачаканая Перамога. Вайна забрала ў яго двух малодшых братоў, з якіх адзін загінуў у Польшчы, другі на радзіме — на Магілёўшчыне. Акупанты забілі яго бацьку і спапялілі родную хату.

Дзявятага мая пераможнага сорак пятага Аляксандр Ігнатовіч сустрэў у Чэхаславакіі — у той дзень яму споўнілася ўсяго толькі дваццаць два гады. Аляксандр Іосіфавіч і дагэтуль памятае, як радаваўся, пачуўшы вестку пра капітуляцыю Германіі, і як аднапалчане ў той жа дзень віншавалі яго з днём нараджэння. Такое ніколі не забываецца!

Напярэдадні двайнога свята ветэрана да яго прыйшлі ўдзельнікі народнага ансамбля «Мазырскія гармонікі», каб наладзіць маленькі віншавальны канцэрт, успомніць песні ваенных гадоў, паспяваць, паслухаць успаміны франтавіка. Сяргей Баханка, Уладзімір Гурын, Валянцін Мухін, Генадзь Шавялёў *(яны на фота разам з ветэранам)* як заўсёды прыхапілі свае звонкія гармонікі, бо такая склалася ў калектыве традыцыя: музыкай і песнямі абуджаць памяць і нагадваць пра вечныя каштоўнасці.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*г. Мазыр.*

ISSN 1990 - 763X

19084

9 771990 763008

# ПАМЯТАЕМ, ШАНУЕМ, ГАНАРЫМСЯ

**ЗАЎТРА, 9 мая, краіна 74-ы раз адзначыць самае галоўнае свята — Дзень Перамогі... Нягледзячы на дажджлівы пачатак тыдня, сіноптыкі абяцаюць спрыяльнае надвор'е. Але нават калі ў нябеснай канцылярыі нешта пойдзе не так, гэта не паўплывае на агульны настрой. Людзі чакаюць свята, і яно павінна адбыцца на ўзроўні. Не абыдзецца, як заўсёды, без урачыстых мітынгаў, шэсцяў і ўшанаванняў ветэранаў, парадаў з удзелам ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, канцэртных праграм, кірмашоў з пачастункамі і многага-многага іншага... Чаго менавіта? Чытайце ў паведамленнях з месцаў нашых спецыяльных карэспандэнтаў.**

### ❍ Мінск

**Канцэрты, выстаўкі, кірмашы — у Дзень Перамогі мінчанам прапануюць мноства мерапрыемстваў на любы густ.**

Як паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны», традыцыйнае ўскладанне вянкоў і кветак да манумента Перамогі адбудзецца ў 11.00. Галоўным акордам свята стане канцэрт «Бессмяротныя песні» тэлепраекта «Плошча Перамогі — 2019» — сумесны праект Міністэрства культуры Беларусі, Мінскага гарвыканкама і Белтэлерадыёкампаніі.

Кожны раён сталіцы рыхтуе ўласную праграму. Заводскі 9 мая запрашае на свята да «Чыжоўка-Арэны», пачатак у 14.00. Ленінскі — да 12-й гадзіны ў Лошыцкі парк і на пляцоўку перад кінатэатрам «Салют». Маскоўскі чакае мінчан і гасцей сталіцы да 10 гадзін у парку імя М. Паўлава і скверы «Палянка» на К. Лібкнехта. Кастрычніцкі — а 13-й гадзіне ў парку «Курасоўшчына». Жыхары Партызанскага раёна могуць адзначыць свята не толькі ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага, але і на пляцоўцы па адрасе Сталетава, 1, а таксама на вуліцы Карвата на пляцоўцы каля самалёта. Старт — у 12 гадзін. Першамайскі раён збірае гасцей у парку Чалюскінцаў і Батанічным садзе ў 13 гадзін. Савецкі раён — збор а 12-й гадзіне перад «Лідо» па вуліцы Кульман. Фрунзенскі — а 12-й гадзіне пачне мерапрыемствы ў парку 60-годдзя Кастрычніка і парку імя Уга Чавеса. У Цэнтральным раёне з 12 гадзін стартуе забаўляльная праграма ў музейна-паркавым комплексе «Перамога» і Траецкім прадмесці. Яшчэ ў цэнтры сталіцы разгорнецца пляцоўка каля Палаца спорту. Там пройдзе вялікі канцэрт з удзелам прафесійных творчых калектываў і выканаўцаў, а таксама пераможцаў Мінскага гарадскога конкурсу патрыятычнай песні.

У 23.00 па традыцыі запланаваны грандыёзны салют.

### ❍ Брэстчына

**9 Мая зранку пачнецца шэсце кіраўнікоў вобласці і горада, ветэранаў, ваеннаслужачых Брэсцкага гарнізона, актыву грамадскіх арганізацый, удзельнікаў акцыі «Беларусь памятае», моладзі.**

Усе яны накіруюцца ў бок плошчы Цыраманіялаў. Пасля ўскладання кветак да Вечнага агню і вянкоў да пліт мемарыяла адбудзецца жалобны мітынг.

З асобнай праграмай «Памяць сэрца» выступіць духавы аркестр. А каля Паўночных варот крэпасці адбудзецца музычны марафон «Кветкі Перамогі».

Тым часам у парку культуры і адпачынку разгорнуцца народныя гулянні. Творчыя калектывы падрыхтавалі тэматычную праграму. А ўдзельнікі Міжнароднага харавога фестывалю «Берасцейскія харавыя асамблеі» правядуць у парку заключны гала-канцэрт. Акцыі памяці і канцэртныя праграмы адбудуцца ва ўсіх раёнах вобласці.

### ❍ Віцебшчына

**Галоўная плошча Перамогі, адна з самых вялікіх у Еўропе, стане эпіцэнтрам святочных падзей.**

Менавіта тут 9 мая ў 10 гадзін раніцы адбудзецца ўскладанне кветак і вянкоў да манумента ў гонар савецкіх воінаў, партызанаў і падпольшчыкаў Віцебшчыны. Потым — тэатралізаваны мітынг і святочная канцэртная праграма «Дзякуй героям за мірнае неба!».

Віцебская традыцыя ў Дзень Перамогі — ускладанне (у 10.30) кветак да бюста Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы П. М. Машэрава.

Непадалёку ад плошчы Перамогі — у скверы Б. Хмяльніцкага — адбудзецца дэманстрацыя абмундзіравання і ўніформы салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі ваенных гадоў.

Яшчэ ў Віцебску, у былым пасёлку Руба, пройдзе акцыя «Перамога. Музыка. Вясна». Там жа — шэсце, мітынг каля помніка Невядомаму салдату, акцыя памяці загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны «Дзень белых жураўлёў».

Багатая на падзеі праграма святкавання чакаецца і ў раённых цэнтрах.

Абласныя спаборніцтвы па веласіпедным спорце, прысвечаныя Дню Перамогі, 8—9 мая праходзяць у Талачыне. А ў Наваполацку на наступны пасля святкавання дзень, 10 мая, запланавалі правесці гарадскі патрыятычны конкурс інсцэнаванай песні «Мы за мір!».



Фота БелТА.

### ❍ Гомельшчына

**Гомельшчына пачынае адзначаць Дзень Перамогі 8 мая акцыяй «Гомель памятае». А 9 мая адбудуцца памятныя мерапрыемствы каля мемарыяла «Вечны агонь».**

Тут пройдзе ўрачысты мітынг памяці і цырымонія ўскладання кветак да брацкай магілы савецкіх воінаў і падпольшчыкаў. Ветэраны, спартсмены, творчая моладзь і ўсе, хто пажадае, пройдуць у гэты дзень шэсцем па галоўнай вуліцы горада над Сожам.

Баявы самалёт Су-24 стане яшчэ адным помнікам яго стваральніку, Паўлу Восіпавічу Сухому. Ён усталяваны ў рэканструяваным скверы перад галоўным корпусам Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, які носіць імя легендарнага авіяканструктара.

Мерапрыемствы, прысвечаныя перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, працягнуцца і ў наступныя дні. Напрыклад, 10 мая ў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы пройдзе літаратурна-музычны салон «Подзвігам слаўныя нашы земляк».

### ❍ Гродзеншчына

**Святочныя мерапрыемствы разгорнуцца на некалькіх пляцоўках абласнога цэнтра.**

Свята ў Гродне распачнецца з самага ранку: на плошчы Леніна адбудзецца ўрачысты мітынг, а ў парку Жылібера ўшануюць памяць загінулых, усклаўшы кветкі да Вечнага агню.

На працягу цэлага дня будуць ісці святочныя праграмы на плошчы Леніна: «Канцэрт на перадавой», «Пад песні 40-х», «У шэсць гадзін вечара пасля вайны», гасцінна сустрэне гасцей арт-кафэ «Пад адкрытым небам», а побач — на плошчы Тызенгаўза — пачне дзейнічаць інтэрактыўная выстаўка ўзбраення сучаснага войска.

Свята не абміне і Савецкую вуліцу, дзе прагучаць песні Перамогі ў выкананні кавер-бэндаў і вулічных музыкаў. Тут жа прапануюць набыць і адмысловыя сувеніры. На Савецкай плошчы можна будзе ўбачыць выстаўку рэтра-тэхнікі.

Завершацца святочныя мерапрыемствы на Кургане Славы канцэртнай праграмай з традыцыйнай акцыяй «Спяем «Дзень Перамогі» разам» і святочным салютам.

### ❍ Міншчына

**Ва ўсіх кутках Міншчыны 9 мая адсвяткуюць Дзень Перамогі. З гэтай нагоды запланавана шмат мерапрыемстваў — урачыстыя мітынгі, ускладанні вянкоў і, вядома ж, святочны салют.**

А ў горадзе Жодзіне ў гэты дзень адбудзецца абласное свята, якое традыцыйна адкрые мітынг. Да манумента ў гонар маціпатрыёткі Н. Ф. Купрыянавай будуць ускладзены кветкі.

Падчас свята па праспекце Міру пройдзе парад з удзелам навучэнцаў Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча, механізаванай калоны ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі Узброеных Сіл Беларусі, а таксама тэхнікі, што выкарыстоўваецца ў народнагаспадарчым комплексе краіны.

Упрыгажэннем свята стане канцэртная праграма аматарскіх і прафесійных калектываў і выканаўцаў. Усе ахвотныя змогуць наведаць кірмаш з пачастункамі і сувенірамі.

Завяршыцца мерапрыемства яркім канцэртам на стадыёне «Тарпеда».

### ❍ Магілёўшчына

**Марш воінскіх часцей Магілёўскага гарнізона, шэсце-парад «Беларусь памятае», мітынг каля Вечнага агню на плошчы Славы, святочны канцэрт — Магілёў урачыста сустракае 74-ю гадавіну Вялікай Перамогі.**

Усё больш магілёўчан прымаюць удзел у акцыі «Беларусь памятае» і ідуць у святочнай калоне па вуліцы Першамайскай з партрэтамі сваіх гераічных продкаў. Для ветэранаў па традыцыі падрыхтаваны спецыяльныя аўтамабілі. Усяго ў горадзе запланавана больш за 20 розных мерапрыемстваў, прысвечаных пераможнаму маю. Яны пачнуцца а 10-й гадзіне раніцы і закончацца а 23-й гадзіне вечара салютам над Дняпром. Пра ліхія франтавыя нагадае традыцыйная палявая кухня каля гандлёвага цэнтра «Магніт», гарадская акцыя «Вальс Перамогі» на плошчы Зорак, салдацкая паляна ў Пячэрскім лесапарку, канцэртна-забаўляльныя мерапрыемствы ў розных куточках горада.

А 8 мая ветэраны, прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадскіх арганізацый, моладзь прымаюць удзел у перапахаванні знойдзеных пры пошукавых работах астанкаў абаронцаў Магілёва на мемарыяльным комплексе «Лагер смерці» па праспекце Шміта.

Сёння ў Магілёве засталося ўсяго 247 ветэранаў вайны, за год іх колькасць скарацілася на 73 чалавекі.

***Вольга АНУФРЫЕВА, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Святлана ЯСКЕВІЧ.***

## З БОЛЕМ У СЭРЦЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну ў сувязі з ахвярамі пажару на самалёце авіякампаніі «Аэрафлот».**

«У Рэспубліцы Беларусь з глыбокім смуткам і болем успрынята трагічнае паведамленне аб пажары на борце пасажырскага самалёта авіякампаніі «Аэрафлот» у маскоўскім аэрапорце Шарамеццева, які прывёў да шматлікіх чалавечых ахвяр», — сказана ў спачуванні.

Беларускі лідар перадаў словы падтрымкі і спагады родным і блізкім загінулых, а таксама пажадаў хутчэйшага выздараўлення пацярпелым.

**Паводле БелТА.**

## ВЕРБНЫ НАПАМІН

Побач з Курганам Славы з'явілася алея ў гонар жанчын-ветэранаў

Ідэя ўвекавечыць памяць аб прадстаўніцах прыгожага полу, якія адстойвалі незалежнасць роднай зямлі нараўне з мужчынамі, належыць Беларускаму саюзу жанчын. Арганізацыя напярэдадні 75-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў распачала праект «Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі». Алея на подступах да знакамітага Кургана Славы — маўклівы напамін пра няпростыя лёсы беларусак, жыццё якіх было апаленае вайной. Дрэвы для яе выбралі невыпадковыя: вербы, якія ў народзе завуцца плакучымі і сімвалізуюць тугу.

— Няхай новая алея стане сімвалам Перамогі і міру. Трэба рабіць усё, каб вайна не стала далёкім мінулым і захавалася ў памяці не толькі пакалення, якое праз яе прайшло, але і нашчадкаў пераможцаў, — упэўнена **Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня Беларускага саюза жанчын.**

Разам з членамі прэзідыума БСЖ і прадстаўніцамі саюза жанчын Беларусбанка вербы каля Кургана Славы высаджвалі і байкеры мотаклуба «AnGirls».

**Ганна КУРАК.**

## АСАБЛІВАЯ ЎВАГА

9 мая па ўсёй краіне пройдуць святочныя мерапрыемствы

— Асобы ў алкагольным і наркатычным ап'яненні не будуць дапушчаны да прапускных пунктаў. Асаблівы клопат і ўвага ветэранам — для іх будзе арганізавана індывідуальнае праходжанне апошніх, пасля мерапрыемстваў іх адвязуць дадому на службовых аўтамабілях. У святочны дзень будзе абмежаваны рух транспартных сродкаў. Да 13 гадзін выхад на станцыі метро «Плошча Перамогі» будзе адкрыты толькі ў бок праспекта Машэрава, — расказаў **Дмітрый КУР'ЯН, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення аховы правапарадку галоўнага ўпраўлення правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў.**

**Станіслаў САЛАВЕЙ, старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ міліцыі грамадскай бяспекі МУС,** расказаў, што каля ўсіх месцаў правядзення мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня Перамогі, будзе прысутнічаць Дзяржаўтаінспекцыя. З 7 да 13 гадзін і з 17 да 24 гадзін плануецца перакрыццё руху па праспекце Незалежнасці ад вуліцы Янкі Купалы да вуліцы Казлова, ад праспекта Незалежнасці да вуліц Першамайскай і Чырвонай.

**Анатоль БАЛЯБІН, намеснік начальніка ўпраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС,** і **Алег ПАНЧУК, начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя,** паведамілі, што гатовы да любых надзвычайных сітуацый: да 9 мая арганізавана работа бальнічных арганізацый і брыгад хуткай медыцынскай дапамогі, часовых медыцынскіх пунктаў, наладжана ўзаемадзеянне з клінічнымі бальніцамі сталіцы. Таксама будзе весціся асобы кантроль за станам здароўя ветэранаў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Куля, асколкі і кроў сібірачак

## Як вясковы юнак стаў баявым афіцэрам і перажыў вайну...



З вучнямі СШ № 2 г. Чавусы, якія рэгулярна наведваюць ветэрана.

**22 чэрвеня для Уладзіміра Марчанкі — асаблівая дата: свята дня нараджэння і смутак пачатку вялікай бяды. У гэты дзень у 1920 годзе ў весцы Ерашоўка Клімавіцкага раёна ён з'явіўся на свет, і ў гэты ж дзень, праз 21 год, курсант Марчанка, як і мільёны савецкіх хлопцаў, стаў пад ружжо, гатовы аддаць жыццё ў барацьбе з ворагам.**

«Не жыццё, а казка», — так даволі нечакана пачаў расказ пра сваё баявое мінулае **ветэран Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір МАРЧАНКА.** Але падчас размовы пачынаеш разумець, што меў на ўвазе ветэран. Сапраўды, калі слухаеш гісторыю гэтага чалавека, які прайшоў вайну ад жудаснага чэрвеня 1941 года да пераможнага мая 1945-га, здаецца неверагодным, колькі можа вытрываць чалавек. Біяграфія Уладзіміра Марчанкі нібыта падручнік гісторыі гэтай жахлівай вайны. Тут і абарона Масквы, і вызваленне Смаленшчыны, і ўдзел у аперацыі «Баграціён», і ліквідацыя Віцебскага «катла», і штурм Кёнігсберга — доўгі і цяжкі шлях савецкага салдата, які бараніў родную краіну.

Калі грымнула вайна, хлопец знаходзіўся ў Валагодскай вобласці, дзе вучыўся ў ваенным вучылішчы. Вялікія страты салдат і каманднага складу з першых дзён вайны вымусілі кіраўніцтва навучальнай установы скараціць тэрмін вучобы, і ўжо ў жніўні Уладзімір Марчанка прызначаны камандзірам узводу. Маладога неабстралянага курсанта адправілі абараняць савецкую сталіцу. У снежні 41-га пад Калінінам ён быў паранены, жыццё выратавала тое, што асколак страціў забойную моц, трапіўшы ў дакументы і грошы, што ляжалі ў нагруднай кішэні.



Уладзімір МАРЧАНКА з баявымі сябрамі.

Пасля шпіталя Уладзіміра Васілевіча ў хуткім часе накіравалі ў 19-ю гвардзейскую стралковую дывізію начальнікам штаба лыжнага батальёна. У складзе гэтай дывізіі Уладзімір Васілевіч вызваляў Смаленскую вобласць, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, з ёй жа ў 1943 годзе ступіў на родную зямлю. У баях за чыгуначную станцыю Крынкі, што каля Лёзна, воін атрымаў другое раненне. Падлячыўшыся, ён зноў папрасіўся ў родную дывізію.

— На дарогу ў войска мне далі дзесяць дзён і мяшок сухароў. Бачачы, што час дазваляе, вырашыў па дарозе заскочыць дадому ў Ерашоўку, праведаць маці, сваякоў. Пагледзець, як ладзіцца іх жыццё, дапамагчы чым змог бы. Сэрца аблівалася крывёю, калі ўвайшоў у родную вёску ці, хутчэй у тое, што ад яе засталося. Усе хаты немцы, калі адступалі, спалілі, сярод гарэлых плямін тырчалі толькі коміны печак. Людзі туліліся хто дзе знайшоў паратунак, — апісвае ўбачанае ветэран. — Ніхто не чакаў майго прыезду. Але пакуль ішоў па вёсцы, мяне пазналі, і нехта сказаў маці: Пелагея, глядзі, твой сын ідзе. Маці кінулася мне насустрач, абняла і плача ад шчасця...



Радасць спаткання была азмрочана весткамі, што сястру Уладзіміра Марчанкі фашысты сагналі ў Нямеччыну, і які яе напаткаў там лёс, было невядома. Зрабіўшы для маці зямлянку, салдат адправіўся далей на фронт, дзе пад Багушэўскам дывізія вяла баі з праціўнікам.

Падчас аперацыі «Баграціён» камандзіру не раз прыходзілася пад куляміісці наперад і весці за сабою салдат. А таксама прымаць удзел у ліквідацыі Віцебскага «катла».

— Мы добра ведалі, як паводзяць сябе немцы, вырваўшыся з атачэння, і якую за гэта «цану» плаціць мірнае насельніцтва. З гэтай прычыны быў строгі наказ: ніводзін фашыст не павінен быў прасачыцца праз нашы лініі. І мы ўтрымалі пазіцыю, прымусілі фашыстаў здацца.

За паспяховае выкананне задання Уладзімір Марчанка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга з прысваеннем звання капітана. Далей былі баі ў Паўночнай Беларусі, вызваленне Літвы і нават уступленне на тэрыторыю ворага. У бітве за Кёнігсберг капітан Марчанка атрымаў трэцяе раненне.

— Каля мяне разарваўся снарад, і асколак, рассекшы ордэнскую планку, прабіў грудзі крыху вышэй за сэрца. Лежачы на зямлі, я ўжо развітваўся з гэтым светам. Але салдаты мяне выцягнулі з-пад агню і толькі дзякуючы ім я жывы, — успамінае ветэран. — Шмат крыві я тады страціў, але і тут мне пашанцавала, што знайшліся людзі, якія здалі сваю кроў для мяне. Як потым стала вядома, гэта былі жанчыны-сібірачкі. Дзякуючы іх сібірскай крыві я сустракаю 99-ю вясну.

Воляй лёсу скончыў вайну Уладзімір Марчанка ў горадзе, з якога і пачынаў свой баявы шлях да Перамогі, менавіта ў Волагду на лячэнне быў накіраваны паранены. Тут жа афіцэр даведаўся і пра заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны. 12 мая камісаваны камандзір пакінуў сцены шпіталя і паехаў у родную Ерашоўку, дзе чакала стваральная праца пад мірным небам...

**Андрэй САЗОНАЎ.**
**Фота аўтара.**

# Жывая памяць

**Гэты здымак зроблены ў 1975 годзе каля сцяга Перамогі ў Маскве. Сфатаграфавацца каля святой рэліквіі было найвышэйшай формай заахвочвання перад юбілеем — 30-годдзем Перамогі. Такога гонару ўдастойваліся пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва, маладыя работнікі і работніцы неабсяжнага Савецкага Саюза.**

Адной з такіх пераможцаў стала тады мантажніца электраапаратуры Мінскага электрамеханічнага завода Тамара Антонаўна Мельнік (Стэльмак). Цяпер яна на заслужаным адпачынку.



Тамара Антонаўна МЕЛЬНІК *(у верхнім радзе крайняя злева).*

— 1975-ы быў ці не апошнім годам годнага жыцця ў СССР, — успамінае Тамара Антонаўна свае ўражанні тады і цяпер. — Краіна жыла, развівалася, адчувалася яе магутнасць. Усё гэта было на вачах жывых яшчэ франтавікоў і ўдзельнікаў вайны. Мой бацька перанёс фашысцкі канцлагер, вярнуўся адтуль гранічна знерваваным. Маці ў час акупацыі жыла ў глухой лясной вёсачцы Мачынск на Асіповіччыне (пазней вёску спалілі паліцаі).

Само слова «вайна» мела для нас выразнае значэнне асабістага гора. Выхаваныя ў патрыятызме, на фільмах і літаратуры таго часу, мы адчувалі яе смяротны подых, бачылі яе ў снах, перажывалі за тых, хто працягваў зведваць жахі знішчэння ў розных кутках планеты. Спачуванне іншым — гэта ці не найлепшае ў выхаванні. Скажу, што ў гэтым сэнсе мы сваіх бацькоў не падвялі, не здрадзілі нашым настаўнікам, многія з якіх былі на фронце (сёння ўсе яны спачываюць у зямліцы).

Канешне, шкада, што народы разбегліся, разбрыліся, казаць пра інтэрнацыяналізм не даводзіцца, не моднае гэта слова. Усё больш ідуць пошукі ворагаў. А ці ж могуць быць ворагі сярод тых, з кім столькі гадоў жылі ў адной дружнай сям'і? Таму сцяг Перамогі грэе сэрца. Лічу, заслуга нашага пакалення ў тым, што найлепшыя якасці беларусаў мы захавалі пад яго абаронай, перадалі спагаду да ближняга сваім дзецям. Хай і яны перададуць унукам беларускую дабрыню. Разам з памяццю пра святую Перамогу.

**Віктар ХУРСІК.**

# ПЕРАМОГА Ў ЭКСПАНАТАХ

**Вызваленне Магілёўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалося ў верасні 1943 года з Бранскай і Смаленска-Рослаўльскай наступальных аперацый. У кароткія тэрміны атрымалася ачысціць ад ворага восем паўднёва-ўсходніх раёнаў вобласці. Але шмат баёў было вельмі цяжкіх і зацяжных. Выхад паскорыла маштабная наступальная аперацыя «Баграціён», якая пачалася ў чэрвені 44-га. Прасачыць увесь гэты нялёгкі вызваленчы шлях можна на выстаўцы Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Еўдакіма Раманава «Перамога нам у агні дасталася». Матэрыяламі да яе падзяліліся Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру».**

Усе рэчы, пачынаючы ад фота і дакументаў і заканчваючы прадметамі баявой амуніцыі ўдзельнікаў тых баёў, арыгінальныя. Сярод іх асабістыя рэчы і фотаздымкі знаных военачальнікаў — камандуючага 4-й паветранай арміяй 2-га Беларускага фронту генерал-палкоўніка авіяцыі Канстанціна Вяршыніна, Героя Савецкага Саюза камандзіра 399-й стралковай дывізіі генерал-маёра Даніла Казакевіча і камандзіра 42-й стралковай дывізіі палкоўніка Антона Сліца, камандуючага 50-й арміяй генерал-лейтэнанта Івана Болдзіна і іншых. Кіцелі, планшэты, ручкі, трафейныя рэчы — усё гэта дыхае тым ужо далёкім ад нас часам і нясе дадатковую інфармацыю пра сваіх уладальнікаў. Цэлы комплекс прысвечаны 1-й польскай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі, якая ў кастрычніку 1943 года прыняла бой пад вёскай Леніна ў Горацкім раёне. Дывізія панесла вялікія страты, трое яе байцоў атрымалі званні Герояў Савецкага Саюза, каля дзвюх з паловай сотняў атрымалі ордэны і медалі. На выстаўцы шмат прадметаў часоў вайны, знойдзеных падчас раскопак пошукавым клубам «Віккру» і 52-м асобным батальёнам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Тут жа серыя фотаздымкаў ад клуба «Віккру» з месцаў раскопак перыяду 1994—2018 гадоў. Прасякнуцца атмасферай часоў 75-гадовай даўніны дапамагаюць адмысловыя інсталяцыі.

— Чым цікава гэтая выстаўка, дык гэта тым, што тут шмат вельмі рэдкіх, мемарыяльных рэчаў, — кажа **загадчыца экспазіцыйна-выставачнага аддзела Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея Аляксандра БУРАКОВА.** — Мы, напрыклад, з цікаўнасцю разглядалі ўнікальныя фотаздымкі вызвалення Бабруйска і Магілёва, якія прадставіў дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Такіх у нашай калекцыі наогул не было. На выстаўцы ёсць шмат арыгінальных дакументаў, схем, плакатаў. Напярэдадні Дня Перамогі кожнаму будзе карысна ўсё гэта паглядзець, каб ацаніць, наколькі няпросты і ахвярны была для нас тая Перамога.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Кожны трэці *Сумесны праект «Звязды» і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны*




# ХАДЖЭННЕ НАД БЕЗДАННЮ

## Так сведкі называлі жыццё ў акупацыі

**Вайна — гэта не толькі калі страляюць. Гэта нягоды, пакуты, голад, хваробы. Гэта страх, які ніколі не адпускае. На акупаванай тэрыторыі злачынствы чыніліся ці не ў кожным населеным пункце, і простыя людзі часта станавіліся сведкамі забойстваў і катаванняў. Людзі гінулі ў лагерах смерці і турмах. Але былі і тыя, каму ўдалося прайсці праз такія выпрабаванні, выжыць і расказаць пра тое, што адбывалася за кратамі... Такія гісторыі збіраюцца і захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Шмат было занатавана адразу, па гарачых слядах. Але лісты з прыватнымі ўспамінамі яшчэ доўгія гады працягвалі паступаць у музей, і такія дакументы складаюць асобны фонд.**

Дзякуючы спецыяльнаму праекту музея сёння мы можам пачуць галасы сведак трагічных падзей.

*«Не паспеў дабегчы да пажарышча, як мяне перахапіў немец з паліцэйскім і павялі на шашу. Там ужо стаялі людзі з рыдлёўкамі. Немец нешта загадаў паліцэйскаму, і той казырнуў, распарадзіўся, каб я ішоў за ім. Так мы аказаліся ў Смалярцы. Рэшту ночы і амаль увесь дзень туды бесперапыннай плынню прыбывалі вялікія крытыя машыны з людзьмі. Калі яма даверху запаўнялася трупамі, немцы яе пасыпалі вапнай і пяском, а затым загадвалі нам засыпаць цалкам.*

*Усякі раз, калі мы падыходзілі да ям, рыдлёўкі валіліся з рук, таму што ў большасці выпадкаў даводзілася засыпаць не трупы, а жывых людзей. Часта сыплеш пясок у яму, а ён варушыцца. Гітлераўцы, якія стаялі тут жа, заўважаючы з нашага боку ў такіх выпадках збянтэжанасць, выбухалі лаянкай і пускалі ў ход прыклады аўтаматаў.*

*Быў відавочцам спробы да ўцёкаў двух мужчын. Але дзе там было ўцячы... І дзесяць крокаў не паспелі зрабіць смельчакі, як тут жа былі ўложаны з аўтамата».* (Адразу пасля вызвалення Бярозаўскага раёна ўспамінаў Андрэй Ляўковіч.)

У праекце «Галасы з пажоўклых старонак» супрацоўнікі музея на камеру чытаюць лісты і ўспаміны сведак. Відэаролікі выкладзены на сайце музея. Паспрабаваць сябе ў ролі акцёраў і зачытаць успаміны пра вайну прапаноўвалася падчас экскурсій і наведвальнікам установы. Але не ўсім удалося дачытаць лісты сведак да канца. Людзі прызнаваліся, што ім цяжка працягваць, у некаторых выступалі слёзы... Сапраўды, калі трымаеш у руках ліст канкрэтнага чалавека, адчуванне такое, быццам з табой дзеліцца ўспамінамі нехта вельмі блізкі...

*«Пасля абеду ўсе жанчыны камеры, стоячы на каленях, маліліся. Маліліся доўга, прасілі ў Бога не аб тым, каб застацца ў жывых. Прасілі, каб савецкі снарад ці бомба прамым пападаннем патрапілі ў нашу турэмную камеру і ўсіх адначасова пахавала.*

*Пад вечар пачалі часта адкрывацца дзверы камер, чуліся стогны. Па калідоры гулка грукалі нямецкія боты. Узмоцнена білася сэрца, у мозгу нараджаліся думкі: напэўна, хутка і мяне павядуць на допыт, будуць біць, толькі б вытрымаць і хутчэй высветліць прычыну арышту.*

*А можа, расстраляюць? Гэта ж столькі ўжо расстралялі і павесілі... А дзеці? Хіба мае дзеці лепшыя за іншых. У думах чаканне, здавалася, доўжылася бясконца.*

*Але вось звякнуў ключ нашай камеры, і мяне з маёй напарніцай павялі на допыт.*



*У кабінет, дзе вёўся допыт, упіхнулі мяне, перад сталом следчага прымусілі стаць на калені, загадалі зняць сукенку. Ззаду стаяў гестапавец з гумавай дубінкай у руках. У гэты момант я не адчувала страху смерці. Мне нікога не было шкада, нават дзяцей. Я старалася пра іх не думаць...*

*Мяне пачалі біць гумавай палкай. Да дзевяці ўдараў я далічыла, пасля страціла прытомнасць. Мяне адлілі вадой. І першыя словы, якія я пачула: «Навошта б'еш па галаве? Магчыма, гэта не яна...» Калі ўбачылі, што я апрытомнела, зноў пачалі біць. Білі ботамі ў грудзі, жывот, спіну, а пасля прапанавалі назваць сваё прозвішча і імя.*

*Я — Хатчанка Надзея, а ў іх былі даныя на Харчанка Дзіну. Справа ў тым, што прозвішча Хатчанка амаль не сустракаецца, а Харчанка даволі часта, таму многія маё прозвішча скажалі. Паколькі мае прозвішча і імя не сыходзіліся, доказаў супраць мяне не было. І смерць, быццам у роздуме, спынілася.*

*Пасля допыту вечарам таго ж дня мяне вызвалілі. Ад пабояў я доўга ляжала хворай.*

*На самай справе ўсе гады акупацыі прайшлі як хаджэнне над безданню, якое ўяўляла адно цэлае. Часам мне самой яны падаюцца неверагоднымі. Усё ж гэта рэчаіснасць, і ўсё ж гэта было!»* (З успамінаў мінскай падпольшчыцы Надзеі Хатчанкі.)

Пра такую вайну не пачытаеш у падручніках, не пачуеш падчас класічных экскурсій. І калі «галасы з пажоўклых старонак» гучаць у адпаведна аформленых сценах музея, сапраўды складваецца ўражанне, што трапляеш на месца жахлівых падзей.

Сёння многа робіцца для выхавання патрыятызму. Але ўсё часцей ускрываюцца новыя тэмы, калі моладзь бачыць, што вайна гэта не толькі гераізм, подзвігі, але і пакуты. І зварот да эмоцый — ці не найлепшы аргумент супраць вайны? Супрацоўнікі музея шукалі новыя формы, як падаць інфармацыю сучаснаму пакаленню. І калі падчас мінулай «ночы музеяў» прапанавалі маладым людзям зачытваць успаміны людзей, якія прайшлі праз цяжкія выпрабаванні, заўважылі, наколькі моцнае эмацыянальнае ўздзеянне аказваюць такія «хвілінкі памяці».

Аўтар ідэі «галасоў з пажоўклых старонак» — Яўген Пашкевіч — расказвае: «Мы хацелі ўзяць прыватныя выпадкі, паказаць асабістыя трагедыі. Адбіралі гісторыі, якія б можна было пакласці на відэафармат і стварыць сюжэты працягласцю паўтары-тры хвіліны». У першых роліках праекта супрацоўнікі музея вырашылі раскрыць такую тэму, як акупацыя Беларусі. Пра яе распавядаюць не толькі падпольшчыкі ці ваеннапалонныя, але і простыя людзі, якія маглі і выпадкова трапіць у гэты замес. Супрацоўнікі музея цытуюць успаміны вязняў гета, турмаў, лагераў смерці. Але і непасрэдныя ўдзельнікі ваенных падзей могуць расказаць пра непрывабную, жахлівую, невядомую нам вайну.

*«Пятніца 2 чэрвеня. Другі дзень жыцця на балоце. Спім у вадзе, падклаўшы пад сябе галінак з бярозы. Знізу вада, а зверху дождж — таксама вада.*

*Харчуемся сухарамі і салам. Немцы і паліцыя блакіравалі наша адступленне ў Казьянскія лясы. Што б ні здарылася, неабходна было прарваць кальцо праціўніка і выйсці ў тыл карнай экспедыцыі...*

*Сёння трэці дзень жывём на балоце... Немцы ачышчаюць вёскі. Забіраюць усю скаціну, насенне і дарослых мужчын. Далёка чуецца рыканне кароў: нямецкія пастухі гоняць іх на балота. Метраў за 70 ад нас запрацаваў варожы аўтаматчык. Мы ў складзе брыгады і атрада № 3 сышлі глыбей у балота, якое на карце значылася як непраходнае.*

*Аўторак 6 чэрвеня. Шосты дзень жыцця на балоце...*

*Адборныя карнікі-галаварэзы ўсё бліжэй падыходзяць да нас. Добра ўжо чутна іх лаянка і гаворка. Па нацыянальнасці яны былі розныя: немцы, чэхі, палякі, румыны, фіны, украінцы, рускія, латышы, літоўцы, эстонцы, беларусы і іншыя...*

*Размова немцаў і паліцаяў усё гучней набліжалася да нас. Ісці далей было немагчыма. Вырашылі неадкладна пагружацца ў дрыгву, якая ахвотна прыняла нас па самую шыю, а на галовы давялося надзець кавалкі моху, і так мы ў дрыгве пратрымаліся з 14.00 да 20.00 вечара, пакуль не прайшлі тры ланцугі карных войскаў. Яны ўвесь час штыкамі паролі махавыя купіны. І прастрэльвалі аўтаматамі.*

*У гэты трагічны дзень загінула вельмі многа партызан. На балоце трупы хутка гнілі, і паўсюль разносіўся смурод. Карціна была жахлівая.*

*Працягваем жыць восьмы дзень на балоце. Начлег зладзілі на балоце і спалі да 10.30 раніцы. Затым прачнуліся. Замест сняданку паглядзелі адзін на аднаго і моўчкі ўзялі курс на возера Ельня. Ногі ўжо не рухаюцца. Ледзьве паўзём.*

*Ад карнай аперацыі шукала сабе паратунку і цывільнае насельніцтва, якое загадзя зносіла ў пэўныя знаёмыя ім месцы муку, крупы і іншыя прадукты. Аднак пад націскам карнікаў цывільнае насельніцтва кідала свае бедныя запасы і сыходзіла ўглыб балота. Мы ў некалькіх месцах знаходзілі жытнюю муку, якую зносілі ў адно месца і арганізоўвалі так званую мучную базу. Посуду для прыгатавання ежы ў нас не было. Калатуху з мукі рабілі адразу ў лужыне і сырое цеста ўжывалі як дэлікатэс...»*

(З успамінаў партызана.)

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ,**
**Таццяна ПАЛІТЫКА.**




Вернісаж. Памяць сэрца *Сумесны праект «Звязды» і Нацыянальнага мастацкага музея*

# ПА КІМ СУМУЮЦЬ «ПАРТЫЗАНСКІЯ МАДОННЫ»

**Міхаіл Андрэевіч Савіцкі (1922—2010) — у беларускім мастацтве постаць, без перабольшання, легендарная. Яго імя даўно стала хрэстаматыйным, а лёс выдатнага творцы цесна пераплецены з лёсам роднай краіны.**

Нарадзіўся Савіцкі 18 лютага 1922 года ў вёсцы Звянячы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і селяніна. У 1940 годзе, пасля заканчэння школы, быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, з пачатку вайны прымаў удзел у абароне Севастопаля ў складзе 345-й стралковай дывізіі, з 4 ліпеня 1942 года да 29 красавіка 1945 года знаходзіўся ў палоне ў канцлагерах у Дзюсельдорфе, Бухенвальдзе, Мітэльбау-Доры, Дахау. Пасля вызвалення з лагера працягваў службу ў Савецкай Арміі. У 25-гадовым узросце Савіцкі выбраў прафесію мастака, скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (курс знакамітага Валянціна Волкава), потым паехаў у Маскву — вучыцца ў Маскоўскім мастацкім інстытуце імя В. І. Сурыкава ў Дзмітрыя Мачальскага. Ён выпусціўся з чырвоным дыпломам, а дыпломны жывапісны твор «Песня» (1957) быў адразу набыты ў калекцыю Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Вядомасць і папулярнасць да мастака прыйшлі ў 1960-я гады і былі звязаны з новымі павевамі ў выяўленчым мастацтве. Гэта быў час «хрушчоўскай адлігі» — час, калі мастацтва шукала новы погляд на рэчаіснасць, час станаўлення прынцыпаў «суровага стылю» ў савецкім мастацтве, час фарміравання яркіх індывідуальнасцяў. Міхаіл Савіцкі ўвайшоў у мастацтва са сваім разуменнем ролі мастака і творчасці ў грамадстве, са сваёй асабістай пазіцыяй, з адметным, новым поглядам на ваенную тэму. У адрозненне ад мастакоў 1940—1950-х гадоў, якія імкнуліся стварыць гераічны летапіс ваенных гадоў, Міхаіл Савіцкі расказваў пра трагічную з'яву, пра нечалавечыя выпрабаванні, якія выпалі на долю людзей у гады ваеннага ліхалецця. Яго мастацтва заўсёды выклікала непадробную цікавасць, спрэчкі і палеміку, бо ў ім спалучаліся і трагедыя, і мужнасць, і прыгажосць адначасова.


Віцебскія вароты. 1967. Палатно, алей. 249х300.

**«Партызаны» (1963)** — першая работа, у якой выразна выявіліся драматычны і напружаны стыль мастака. Фрагментарнасць кампазіцыі і манахромнае, амаль чорна-белае, каларыстычнае рашэнне палатна нагадваюць кадр з хронікі. Тэма карціны — развітанне перад баявым заданнем — падаецца як спроба зафіксаваць вырашальны момант у жыцці чалавека. Менавіта з такіх момантаў і складаліся ваенныя будні Беларусі. Невядома, ці сустрэнуцца гэтыя людзі яшчэ раз, а можа, гэта развітанне назаўсёды?..

Неаднаразова мастак звяртаўся да партызанскай тэматыкі і кожны раз рабіў гэта неардынарна і эмацыянальна пранікнёна. Маштабнае, манументальнае палатно **«Віцебскія вароты» (1967)** расказвае пра трагедыю бежанцаў вайны. Віцебскія, або Суражскія, вароты — умоўная назва саракакіламетровага прахода паміж савецкай і акупаванай тэрыторыяй, які існаваў сем месяцаў (люты — верасень 1942 года) і абараняўся партызанамі Віцебшчыны, у тым ліку легендарным атрадам «Бацькі Міная». Існаванне такога адносна свабоднага прахода дазволіла вывесці ў савецкі тыл каля 200 тысяч чалавек мірнага насельніцтва, а з савецкага боку на акупаваныя тэрыторыі пераходзілі дыверсійныя групы, увозілася зброя, боепрыпасы, медыкаменты, літаратура. Гэта быў адзін з найважнейшых стратэгічных пунктаў развіцця партызанскага руху ў Беларусі. Міхаіл Савіцкі знайшоў вельмі дакладную алегорыю гэтым падзеям. Галоўныя героі яго жывапіснага палатна — плынь жанчын, дзяцей, старых, параненых воінаў, якія пакідаюць родныя мясціны пешшу; усё, што яны забралі з сабою, нясуць за плячыма ў прасцінах або ў торбах у руках. Партызаны за пагоркамі ідуць у супрацьлеглым напрамку, яны абараняюць гэты натоўп. Агульная кампазіцыя палатна — з вышыні, вельмі высокая лінія далягляду і ярка-чырвоная паласа неба — зарыва вайны. Самае выразнае на карціне — вобразы напісаных персанажаў. Мы бачым стрыманыя, адасобленыя, засяроджаныя твары. Людзі ідуць у трагічнай маўклівасці, і ўнутранае разважанне кожнага складаецца ў агульную сімфонію пра цяжкі лёс беларускага народа падчас вайны.


Партызаны. 1963. Палатно, алей. 125х135.

Вялізны рэзананс у савецкім мастацтве выклікала карціна Міхаіла Савіцкага **«Партызанская мадонна» (1967)**, якая экспанавалася на ўсесаюзнай выстаўцы, атрымала сярэбраны медаль Акадэміі мастацтваў СССР і пасля была набыта ў калекцыю Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. Для савецкага мастацтва гэта была сапраўдная рэвалюцыя, бо такой трактоўкі жаночага вобраза ваенных часоў да Савіцкага не было ні ў кога. У дадзенай карціне мастак спалучыў цэлы шэраг вызначальных сімвалаў. Цэнтральная выява — маці з дзіцем. Сакральны хрысціянскі вобраз падаецца як мадонна часоў Вялікай Айчыннай вайны. Юная жанчына з немаўляткам сядзіць на фоне поля з жытам і жнеямі, а побач з ёй з аднаго боку — тры вінтоўкі, якія стаяць шалашом, і партызан на кані, а з другога — сумная сталая жанчына. Постаць Мадонны прасякнута непарушным спакоем, і гэта ўпэўненасць — гімн перамогі жыцця над смерцю.

Па асабістай просьбе тагачаснага дырэктара Дзяржаўнага мастацкага музея БССР Алены Васільеўны Аладавай Міхаіл Савіцкі стварыў у 1978 годзе аўтарскі варыянт палатна, які называецца «Партызанская мадонна (Мінская)» — для яго мастак зрабіў іншую кампазіцыю. За аснову была ўзята вядомая карціна эпохі Адраджэння «Сікстынская мадонна» Рафаэля — і гэта не выпадкова. Работа Рафаэля падчас вайны разам з іншымі творамі была схавана ў закінутай каменаломні пад Дрэздэнам. У маі 1945 года карціну знайшлі савецкія войскі, і яна трапіла ў сховішчы Пушкінскага музея, пакуль не была вернута разам з усім дрэздэнскім зборам уладам ГДР у 1955 годзе. Перад гэтым «Мадонна» Рафаэля была прадстаўлена маскоўскай публіцы. У той час Міхаіл Савіцкі вучыўся ў Маскве і бачыў гэту выстаўку.


Партызанская мадонна (Мінская). 1978. Палатно, алей. 207х142.

У карціне **«Партызанская Мадонна (Мінская)» (1978)** мастак узнімае тэму гуманізму. Замест біблейскіх персанажаў мастак паказвае простых людзей, сведак чумы ХХ стагоддзя — фашызму. У адрозненне ад мадонны Рафаэля партызанская мадонна Савіцкага паўстае на фоне зямнога беларускага краявіду. У сваёй творчасці Савіцкі распрацаваў новую канцэпцыю гуманізму — гэта гуманізм чалавека, які перажыў вайну, які выдатна разумее цану чалавечага жыцця і ўсведамляе, якая тонкая мяжа разбурэння свету. Гэта стала асноўным маніфестам мастака: ніколі нельга забывацца пра самую страшэнную катастрофу чалавецтва — вайну, якой заўсёды супрацьпастаўляецца жыццё.

Безумоўна, Міхаіл Савіцкі звяртаўся не толькі да ваенных сюжэтаў. Распрацоўваючы іншыя тэмы і жанры, ствараючы гістарычныя, бытавыя карціны або партрэты сучаснікаў, знакамітых дзеячаў культуры і грамадства, ён заставаўся верны сваім канцэптуальным прынцыпам: галоўнае — гэта чалавек-асоба, яго маральнае аблічча.

Бурныя спрэчкі ў грамадстве выклікала серыя твораў Міхаіла Савіцкага **«Лічбы на сэрцы» (1976—1987)**, прысвечаная вязням канцлагераў. Шмат хто казаў, што падобныя жудасныя рэчы не павінны быць аб'ектам мастацтва. А Савіцкі адказваў: «Сама атмасфера нашага стагоддзя выклікае пякучую трывогу за лёс прыгожай планеты і яе галоўны скарб — чалавека. Кожны з нас адказвае за будучыню. З прычыны гэтай адказнасці я не маю права маўчаць. Мне давялося быць сведкам жахлівых злачынстваў». Гэтая серыя перш за ўсё была створана як пратэст супраць зла, каб ніколі не забыліся мільёны тых, хто загінуў у канцлагерах, каб ніколі не паўтарыліся тыя страшныя злачынствы.

Менавіта пад Савіцкага, каб працягваць традыцыі рэалістычнага мастацтва, у 1980 годзе ў Мінску былі створаны Творчыя акадэмічныя майстэрні Акадэміі мастацтваў СССР для паслядыпломнай адукацыі мастакоў па жывапісе, скульптуры і графіцы. Сам Савіцкі казаў так: «Я прыхільнік рэалістычнай школы і лічу мастацтва носьбітам каштоўнасцяў, непадуладных часу. І ў гэтым яго сіла і моц. Такіх прынцыпаў я заўсёды прытрымліваўся і буду прытрымлівацца...» Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, скульптуры і графікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь працягвалі працаваць, пакуль быў жывы іх кіраўнік — да 2010 года. За трыццаць гадоў Міхаіл Савіцкі выхаваў некалькі пакаленняў мастакоў, розных па сваіх творчых метадах і напрамках. Але галоўнае, чаму вучыў маэстра, — гэта актыўная сацыяльная пазіцыя, высокія маральныя якасці мастака. Час фарміруе асобу, але і асоба фарміруе час, нельга заставацца абыякавым да грамадства і рэчаіснасці.

За сваё жыццё Міхаіл Савіцкі быў неаднаразова адзначаны ганаровымі званнямі і ўзнагародамі, ордэнамі: заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1970), народны мастак БССР (1972) і СССР (1978), першы сярод дзеячаў культуры Герой Беларусі (2006), правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР з 1983-га, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1995), Міжнароднай славянскай акадэміі (1996), Міжнароднай акадэміі навук (2002), лаўрэат Дзяржаўных прэмій Беларусі (1970, 1980, 1998), СССР (1973), Міжнароднай прэміі Андрэя Першазванага ў намінацыі «За Веру і Вернасць!» (2000), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне выяўленчага мастацтва (2002), Міжнароднай прэміі імя М. А. Шолахава (2002), прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне літаратуры і мастацтва (2004), першы кавалер ордэна Францыска Скарыны з 1997 года, ганаровы грамадзянін Мінска з 2001-га.

У 2012 годзе ў Мінску была адкрыта Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага, дзе існуе пастаянная экспазіцыя твораў мастака, зробленых за 60 гадоў плённай працы, без перапынкаў і выхадных ад мастацтва.

**Вольга АРХІПАВА, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-12972 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 1), общей площадью 91,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135; капитальное строение, инв. № 440/С-12973 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 2), общей площадью 44,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/1; капитальное строение, инв. № 440/С-12974 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 3), общей площадью 32,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/2

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002618, площадью 0,2097 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), находящимися по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская

Начальная цена продажи – 180 000 руб. (сто восемьдесят тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 9 000 руб. (девять тысяч рублей)

Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 7 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.30.**
**Последний день приема заявлений – 3 июня 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

Утерянные страховые полисы карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY/07/15194695, 14148241, 14148242 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

## Отчет за 1 квартал 2019 года
## ООО «Санта Ритейл»

### Бухгалтерский баланс на 31.03.2019 года

тыс. руб.

| Активы | Код строки | На 31.03.2019 | На 31.12.2018 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 83945 | 80667 |
| Нематериальные активы | 120 | 1928 | 1930 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 10768 | 10079 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 64268 | 65078 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 38 | 39 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **160947** | **157793** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 19141 | 20667 |
| в том числе: материалы | 211 | 1357 | 1089 |
| готовая продукция и товары | 214 | 17784 | 19578 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 267 | 325 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 1229 | 2185 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 10871 | 5390 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 27907 | 27904 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 4636 | 7617 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **64051** | **64088** |
| **БАЛАНС** | **300** | **224998** | **221881** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31.03.2019** | **На 31.12.2018** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 54288 | 54288 |
| Резервный капитал | 440 | 15 | 15 |
| Добавочный капитал | 450 | 3551 | 3570 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 10028 | 10009 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 1140 | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **69022** | **67882** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 124728 | 109099 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | | 95 |
| Доходы будущих периодов | 540 | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **124728** | **109194** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 31247 | 44803 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 27466 | 40197 |
| по авансам полученным | 632 | 9 | 7 |
| по налогам и сборам | 633 | 168 | 196 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 296 | 315 |
| по оплате труда | 635 | 1257 | 1226 |
| по лизинговым платежам | 636 | 1784 | 2616 |
| прочим кредиторам | 638 | 267 | 246 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 1 | 2 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **31248** | **44805** |
| **БАЛАНС** | **700** | **224998** | **221881** |

### Отчет о прибылях и убытках за январь – март 2019 года

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – март 2019 | За январь – март 2018 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 83365 | 63266 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (67991) | (52178) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 15374 | 11088 |
| Управленческие расходы | 040 | (1650) | (1049) |
| Расходы на реализацию | 050 | (15511) | (10524) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | (1787) | (485) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 3742 | 2046 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (854) | (266) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 1101 | 1295 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1234 | 1290 |
